


# «Дзівосная знойдзена дзева...»

Соф'я Гальшанская (1405 – 21.09.1461), польская каралева, чацвёртая жонка Ягайлы. Паходзіла з літоўскага роду князёў Гальшанскіх. Другая дачка (з трох) князя Андрэя Іванавіча Вязынскага Гальшанскага і Аляксандры Дзмітрыеўны Друцкай. Яна была ўнучкай князя Бранскага і Трубуэўскага Дзмітрыя Альгердавіча. Выхоўвалася ў Друцку ў свайго дзядзькі (брата маці) князя Сямёна Дзмітрыевіча Друцкага.

Ягайла пазнаёміўся з Соф'яй Гальшанскай у 1421 годзе падчас гасцявання ў Друцкім палацы. Ён звярнуўся да Вітаўта, каб той садзейнічаў яго жаніцьбе з Соф'яй, бо ад папярэдніх ягоных шлюбаў нашчадкаў не засталося. Выбар Ягайлам жонкі з Вялікага Княства Літоўскага мог захаваць (пры нараджэнні сыноў) правы нашчадкаў Ягайлы на пасад вялікага князя Літвы і Русі. Вітаўт, які ўжо не меў сыноў, падтрымаў намер Ягайлы.

Большасць каралеўскай рады ў Польшчы была супраць жаніцьбы караля з літоўскай князёўнай, бо з палітычных меркаванняў хацела жаніцьбы караля Уладзіслава Ягайлы з Офкай, удавой брата караля нямецкага, чэшскага і венгерскага Сігізмунда Люксембургскага , але яна была бяздзетная, і Ягайла адмовіўся ажаніцца з ёю. Частка польскіх магнатаў на чале з братамі Янам і Пятром Шафраньцамі і іх прыхільнікі падтрымалі намер Ягайлы ажаніцца з літоўскай князёўнай, разлічваючы на ўзмацненне дынастыі Ягайлы і аслабленне прыхільнікаў дынастыі Люксембургаў у Польшчы (якія, дарэчы, намагаліся інкараваць Літву ў склад Польшчы).

Шлюб Ягайлы з семнаццацігадовай Сонькай Гальшанскай (як яе называлі з-за маладосці) адбыўся 24 сакавіка 1422 годзе ў Навагрудку. Пасля прыезду ў Польшчу маладая каралева ўплывала разам з Вітаўтам на палітыку Ягайлы. Канцлерам каронным (польскім) стаў Ян Шафранец, а падканцлерам, па пратэкцыі каралевы Соф'і і Вітаўта, стаў Станіслаў Цёлак. 12 лютага 1424 года Соф'я была каранаваная каралеўскай каронай. Настрой каралеўскага двара ў Кракаве быў да яе непрыхільны як да прадстаўніцы іншай дзяржавы. Аднак пасля нараджэння сыноў пазіцыя каралевы Соф'і ў Польшчы ўзмацнілася. Яна нарадзіла трох сыноў: Уладзіслава (31.10.1424 – 10.11.1444), які пасля Ягайлы быў каралём Польшчы і загінуў у бітве з туркамі каля Варны; Казіміра (16.05. 1426 – 02.03.1427) і Казіміра Ягелончыка (30.11.1427 – 07.06.1492), які быў абраны ў 1440 годзе вялікім князем літоўскім, а ў 1447-м адначасова і каралём польскім. Палітычная пазіцыя Соф'і ўзмацнілася ў канцы 1420-х гадоў. Каралева вяла барацьбу за кароны для сваіх двух сыноў.



*Соф'я Гальшанская*

У час панавання Казіміра Ягелончыка яго маці была дарадцам сына. Каралева Соф'я непрыязна ставілася да інкарпарацыі Вялікага Княства Літоўскага ў склад Польшчы, была прыхільнай да гусіцкага руху ў Чэхіі, вызначалася талерантнасцю. Знаходзячыся ў Кракаве, яна не страціла сувязяў з літоўска-беларускім народам. Пры яе двары знаходзіліся праваслаўныя баяры з яе радзімы. Соф'я была пахаваная ў Кракаве ў Вавельскім кафедральным касцёле ў капліцы Святой Троіцы. Яна стала родапачынальніцай дынастыі Ягелонаў, а таксама многіх сучасных каралеўскіх і княжацкіх дынастый Еўропы (па жаночых лініях).

***Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ***

РЕПОЗИТОРИЙ